УДК 947.6+323.15(476)

І.А. Пушкін

# Грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцяў Беларусі (1991–2005 гг.)

Праблемы нацыянальных узаемаадносін і ролі нацыянальных супольнасцяў у жыцці дзяржавы выклікаюць вялікую зацікаўленасць не толькі сярод навукоўцаў, але і закранаюць у цэлым шырокія колы грамадства. Асаблівую актуальнасць яны набываюць ва ўмовах сучаснага грамадска-палітычнага жыцця.

Прадметам дадзенага даследавання з'яўляліся нацыянальныя меншасці Беларусі (у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацаваны тэрмін – нацыянальныя супольнасці) і які ўдзел яны прымалі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці нашай краіны ў перыяд 1991–2005 гг.

Найбольш выразнай і актыўнай формай удзелу з'яўлялася іх дзейнасць у грамадскіх арганізацыях (ГА) нацыянальных супольнасцяў. Пытанне гэта амаль не даследаванае. У некаторых сучасных публікацыях маюцца толькі пэўныя звесткі аб асобных накірунках дзейнасці ці аб мерапрыемствах, якія праводзіліся тымі ці іншымі нацыянальнымі грамадскімі аб'яднаннямі Беларусі [1–4]. Аналіз працы грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцяў нашай краіны дазваляе вызначыць накірункі іх дзейнасці і ролю ў жыцці айчыннага грамадства.

Нацыянальныя супольнасці складаюць каля 19% насельніцтва Рэспублікі Беларусь і праяўляюць сябе ва ўсіх сферах жыцця нашай дзяржавы. У якасці прыкладу варта прывесці некалькі фактаў, якія сведчаць аб сацыяльным статусе і ролі нацыянальных супольнасцяў у мясцовым самакіраванні ўсходняга і заходняга рэгіёнаў Беларусі. Згодна з дадзенымі аб нацыянальным складзе дэпутатаў Віцебскай вобласці на 29.01.1996 года, у 318 саветах вобласці з 4461 дэпутата прадстаўнікі нацыянальных супольнасцяў складалі 8,1%. У абласным савеце іх было 12,8%, раённых саветах – 9,03%, гарадскіх – 15,5%, сельскіх – 6,8%, пасялковых – 7,9%, гарадскіх саветах абласнога падпарадкавання – 26,4%, гарадскіх саветах раённага падпарадкавання – 7,6% [5]. У Гродзенскай вобласці ў органах выканаўчай улады больш за 20% складалі палякі, каля 30% іх сярод кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў. Пад час выбараў у мясцовыя саветы дэпутатаў 24-га склікання дэпутатамі былі выбраны 687 прадстаўнікоў польскай нацыянальнай супольнасці (21,6% ад агульнай колькасці дэпутатаў) [6].

У 2004 годзе ў Беларусі дзейнічалі 122 грамадскія арганізацыі, якія прадстаўлялі 24 нацыянальныя супольнасці. Сярод арганізацый – 47 яўрэйскіх, 12 польскіх, 9 нямецкіх, па 8 рускіх і літоўскіх, па 5 азер-

байджанскіх, украінскіх і татарскіх, 3 армянскія, 4 цыганскія, па 2 грэчаскія і грузінскія. У Беларусі таксама былі і ёсць нацыянальныя арганізацыі арабаў, афганцаў, башкіраў, дагестанцаў, казахаў, карэйцаў, латышоў, малдаван, сірыйцаў, туркаў, чувашоў, эстонцаў [7].

На абшарах Віцебскай вобласці на 01.01.2005 г. былі створаны і дзейнічалі 18 нацыянальна-культурных аб'яднанняў, афіцыйна зарэгістраваных органамі юстыцыі, і яшчэ 6 структур раённага значэння, якія стаялі на ўліку ў мясцовых органах улады. Аб'яднанні прадстаўлялі 7 нацыянальнасцей і дзейнічалі ў Віцебску, Полацку, Оршы, а таксама ў Міёрскім, Глыбоцкім, Докшыцкім і Пастаўскім раёнах. Сярод іх: 8 – яўрэйскіх, 6 – польскіх, 3 – рускіх, 1 – украінцаў, 1 – латышоў, 1 – літоўцаў, 2 – нямецкіх. На тэрыторыі Віцебскай вобласці плённа працаваў цэнтр нацыянальных культур у Полацку [8].

Аналіз статутаў і справаздач шэрага грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцяў Беларусі з архіва аддзела нацыянальнасцей Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь дазваляе прасачыць іх грамадскую і культурна-асветніцкую дзейнасць.

Адным з першых у Беларусі было зарэгістравана аддзелам культуры Мінскага гарвыканкама ў лютым 1990 г. таварыства «Палонія». У тым жа годзе быў утвораны Саюз палякаў Беларусі (СПБ). Самае масавае нацыянальнае грамадскае аб'яднанне краіны ставіла перад сабою мэты нацыянальнага адраджэння, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, грамадскай актыўнасці палякаў Беларусі, абароны іх нацыянальных і грамадзянскіх правоў, абуджэння грамадзянскай самасвядомасці.

У студзені 1998 года на тэрыторыі Беларусі меліся 10 «Дамоў паляка» (у якасці матэрыяльнай базы СПБ) і 14 польскіх бібліятэк. Грамадскае аб'яднанне мела структуры ў 6 абласцях, 51 раёне, 150 вясковых мясцовасцях, налічвала каля 30 тысяч членаў. СПБ аб'ядноўваў 65 польскіх самадзейных калектываў (з іх 40 у Гродзенскай вобласці): хары, вакальныя групы, ансамблі спеваў і танцаў, танцавальныя калектывы, вакальна-інструментальныя ансамблі, фальклорныя групы. У 1997 годзе ў Гродна быў заснаваны польскі тэатр [9].

Пад эгідай ГА «СПБ» дзейнічалі больш дзесяці структур, у тым ліку: маладзёжныя, студэнцкія, польскае навуковае таварыства, таварыства польскіх гісторыкаў, таварыства медыцынскіх сясцёр і акушэраў, таварыства народных майстроў, таварыства польскіх мастакоў, польскае таварыства ўрачоў на Гродзеншчыне, таварыства жаўнераў Арміі Краёвай, таварыства польскіх ветэранаў, таварыства палякаў – ахвяр палітычных рэпрэсій, спартыўны клуб «Баторы», гандлёва-прамысловая палата, камітэты памяці А. Міцкевіча і Э. Ажэшка і інш. ГА «СПБ» мае ўласны друкаваны орган – штотыднёвую газету «Głos znad Niemna».

У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь на пачатак 2005 года органамі юстыцыі былі зарэгістраваны 8 грамадскіх аб'яднанняў, створаных польскай грамадскасцю Беларусі. У рэспубліцы на польскай мове выдаваліся 4 газеты і 2 часопіса, вялося выкладанне ў школах і спецыялізаваных класах.

У 2005 годзе польскую нацыянальную супольнасць у прадстаўнічых і заканадаўчых органах Беларусі складалі 687 (21,6% ад агульнай колькасці) дэпутатаў мясцовых саветаў, па 2 – у Палаце прадстаўнікоў і Савеце Рэспублікі [10].

У Віцебскай вобласці ўсе польскія арганізацыі аб'яднаны пад эгідаю ГА «СПБ». Асноўная мэта іх дзейнасці – адраджэнне польскай мовы і культуры ў асяродку палякаў вобласці, а таксама, згодна са сцвярджэннямі спецыялістаў абласнога савета па справах рэлігіі і нацыянальнасцей, «падтрымка працэсу пашырэння сферы ўжытку беларускай мовы». Вывучэнне

польскай мовы было арганізавана ў Віцебску, Глыбоцкім, Браслаўскім і Міёрскім раёнах. За апошнія 5 год колькасць вывучаючых польскую мову ўзрасла больш за 2 разы. Удзельнікі вакальнай групы «Глыбачанка» прынялі актыўны ўдзел у фестывалі польскай песні ў Міёрах, сталі лаўрэатамі свята «Квітней, Глыбоччына». У Міёрскім раёне творча дзейнічаў ансамбль польскай народнай песні «Мерыца». Калектывы мастацкай самадзейнасці польскіх нацыянальных аб'яднанняў часта выступалі з канцэртамі ў Польшчы, а спартсмены ўдзельнічалі ў Паланійскіх гульнях у г. Сопаце [11].

Найбуйнейшая этнічная група Беларусі прадстаўлена рускімі. У сацыяльна-палітычным і нацыянальным аспектах для рускага насельніцтва адкрыты шырокія магчымасці і перспектывы для рэалізацыі этнічных і моўна-культурных патрэб. Руская мова з'яўляецца другой дзяржаўнай мовай Рэспублікі Беларусь. У краіне распаўсюджваецца расійская прэса, выходзяць мясцовыя рускамоўныя выданні, існуюць тэатры, на рускай мове вядуцца праграмы радыё і тэлебачання, ажыццяўляецца навучанне ў школах і ВНУ. Акрамя таго, зарэгістраваны і дзейнічаюць грамадскія аб'яднанні, якія аб'ядноўваюць асоб рускай нацыянальнасці. Найбуйнейшае – «Рускае таварыства», якое ставіць на мэце захаванне і прапаганду рускай культуры.

На тэрыторыі Віцебскай вобласці найбольш актыўныя Віцебская гарадская грамадская арганізацыя «Рускі культурны цэнтр «Русь» і ГА «Рускае таварыства». Іх дзейнасць была накіравана на ўмацаванне сувязей з славянскімі нацыянальна-культурнымі аб'яднаннямі Расіі, Украіны, Беларусі, былой Югаславіі. Паспяхова працаваў вучэбна-кансультатыўны пункт «Школа Расіі», вучні старшых класаў прымалі ўдзел у гуманітарных алімпіядах у Маскве. За інтэграцыю з іншымі дзяржавамі і выхаванне ўласнай нацыянальнай выключнасці выступае Віцебская грамадская арганізацыя «Руская абшчына», якая выдае газету «Истоки» [12].

У перыяд 1991–2005 гг. у Беларусі дзейнічаў шэраг украінскіх грамадскіх арганізацый.

З 1995 года бярэ пачатак дзейнасць ГА «Цэнтр украінскай культуры «Січ». Аб'яднанне было створана з мэтай садзейнічання захаванню і развіццю украінскай культуры, самаідэнтыфікацыі украінскага этнасу ў Рэспубліцы Беларусь, стварэння ўмоў для нацыянальна-культурнага развіцця. Пры цэнтры «Січ» дзейнічаў хор украінскай песні «Крыніца», існаваў дзіцячы танцавальны ансамбль, функцыянавалі школа выхаднога дня і «Клуб сяброў Украіны». ГА «Січ» у 1999 і 2002 гг. правяло V і VI рэспубліканскія фестывалі мастацтваў украінцаў Беларусі. У 1996 годзе быў створаны ў г. Брэсце Украінскі навукова-педагагічны саюз Беларусі «Берагіня». Мэта – яднанне педагагічных, навуковых і культурных дзеячаў Беларусі ў справе развіцця сістэмы украінскай адукацыі, вывучэння украінскай мовы, культуры, народнай творчасці і нацыянальных традыцый украінцаў [12, с. 101–103].

У 1990-х гадах у Брэсцкай вобласці былі створаны і дзейнічалі ГА «Прасвіта Берасцейшчыны» імя Т. Шаўчэнкі і Украінскае грамадска-культурнае аб'яднанне. Яны клапаціліся пра захаванне і развіццё мовы, культуры, традыцый і абрадаў украінскага насельніцтва. Аднак паступова іх дзейнасць набыла палітычны, прычым даволі радыкальны, не канструктыўны характар. Спецыялісты Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь у 1998 г. адзначалі, што з боку кіраўніцтва гэтых украінскіх аб'яднанняў гучалі зняважлівыя выказванні наконт тытульнага этнасу – беларусаў, іх мовы, заклікі да перагляду дзяржаўных межаў [12, с. 106–107]. У выніку абедзве грамадскія арганізацыі не прайшлі перарэгістрацыю.

Віцебская грамадская арганізацыя ўкраінцаў «Радзіслаў», якая ўваходзіла ў склад Асацыяцыі ўкраінцаў Беларусі «Ватра», займалася распаўсюджваннем ведаў па гісторыі і культуры Украіны і ўкраінцаў, папулярызацыяй у сваім этнічным асяродку ўкраінскай мовы. У сакавіку 2004 года былі праведзены мерапрыемствы, прысвечаныя 180-годдзю Т.Р. Шаўчэнкі. 16 ліпеня ў Віцебску адзначаўся «Дзень культуры Украіны», які быў прысвечаны 13-й гадавіне незалежнасці Украіны, у якім прыняў удзел пасол Украіны ў Беларусі. Ён перадаў для школы выхаднога дня ГА «Радзіслаў» бібліятэку вучэбнай і мастацкай літаратуры на ўкраінскай мове.

У Беларусі першыя татарскія культурна-асветныя таварыствы ўзніклі восенню 1989 г. у Мінску і Гродна. У 1993 г. мясцовыя таварыствы былі рэарганізаваны ў Беларускае аб'яднанне татар-мусульман «Аль-Кітаб» (з 2000 г. – «Зікр уль-Кітаб»). У 1991 г. актывісты «Аль-Кітаб» упершыню ў гісторыі татар Беларусі пачалі выдаваць на беларускай мове часопіс «Байрам. Татары на зямлі Беларусі». За час існавання часопіса да 2002 г. было выдадзена больш за 40 нумароў. Ён абуджаў самасвядомасць татарскага народа, асвятляў культурную і гістарычную спадчыну. Ад пачатку 1997 г. у Беларусі выдавалася газета «Жыццё» – штомесячнае выданне Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь і аб'яднання «Аль-Кітаб». Газета мела дадатак – бюлетэнь «Жыццё татарскае» і дзіцячую старонку [13].

З мая 1994 г. у рэспубліцы дзейнічала Абшчына беларускіх літоўцаў. Асноўнымі мэтамі таварыства з'яўляліся пашырэнне сяброўскіх сувязяў паміж народамі Беларусі і Літвы, захаванне гістарычнай памяці, культуры, нацыянальнай самасвядомасці, мовы і звычаяў сярод літоўскага насельніцтва Рэспублікі Беларусь. Яно было заказчыкам будаўніцтва ў вёсцы Рымдзюны Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці літоўскага нацыянальнага культурнага цэнтра на сродкі Літвы. У 1996 годзе было завершана будаўніцтва школы, 7 дамоў для настаўнікаў; 1997 г. – пабудаваны інтэрнат на 70 месцаў, сталоўка, дзіцячы сад; 1998 г. – кацельня, зроблена ацяпленне. У 2000 годзе было завершана будаўніцтва дома культуры [14].

У красавіку 1991 г. з мэтай адраджэння яўрэяў Рэспублікі Беларусь як нацыянальнай, так і культурнай супольнасці, іх кансалідацыі было створана Беларускае аб'яднанне яўрэйскіх арганізацый і абшчын. Сюды ўвайшло звыш 135 арганізацый і суполак з 16 гарадоў краіны. За час свайго існавання аб'яднаннем адкрыты 14 нядзельных школ па вывучэнні мовы і культуры яўрэйскага народа, дзве агульнаадукацыйныя школы (у Мінску і Магілёве). Выдаваліся 4 яўрэйскія газеты і спецыяльная газета для моладзі. Працаваў яўрэйскі народны універсітэт.

У Беларусі дзейнічаюць дабрачынныя цэнтры «Хэсэд-Рахамім» (Мінск), «Хасдэй Давід» (Віцебск), «Хэсэд-Эфраім» (Полацк), «Хэсэд-Бація» (Гомель), «Хэсэд-Барух» (Магілёў), а таксама асобныя групы міласэрнасці (Барысаў, Ліда, Мазыр, Орша, Рэчыца, Брэст), якія аказваюць дапамогу састарэлым і хворым. Створана шырокая сетка патранажнай службы. Сярод накірункаў дзейнасці – пракат медыцынскага абсталявання, дапамога адзінокім у быце, дагляд за хворымі, абеды на даму, дробны рамонт, медыцынскія кансультацыі, размеркаванне лекаў, праца клубаў і гурткоў, сумеснае правядзенне свят [15].

Яўрэйскія грамадскія аб'яднанні Віцебшчыны праяўлялі найбольшую актыўнасць у параўнанні з іншымі арганізацыямі вобласці. Так, напрыклад, ГА «Яўрэйскі культурны цэнтр «Мішпоха» выдаваў свой часопіс і газету. Па ініцыятыве аб'яднання «Лухот» працаваў Віцебскі яўрэйскі грамадскі універсітэт гісторыі і культуры. ГА «Таварыства апекі яўрэйскіх могілак Бэталам» выдадзены бібліяграфічны даведнік аб Халакосце, кніга-шляхавод

па Стара-Успенскіх могілках. Культура яўрэйскага народа адлюстроўвалася ў творчасці народнага ансамбля «Віцебскія дзяўчаты» і народнага тэатра песні і музыкі «Мерхавім» Віцебскага гарадскога цэнтра культуры, народнага яўрэйскага канцэртнага ансамбля «Блукаючыя зоркі» Цэнтра нацыянальных культур г. Полацка. У бібліятэках і музеях вобласці праводзіліся выставы «Культура і быт яўрэяў на зямлі Шагала», «Марк Шагал і яўрэйская культура» і інш. [11].

У Мінску зарэгістраваны і дзейнічаюць 1 міжнароднае і 2 рэспубліканскія грамадскія аб'яднанні цыганоў, у г.п. Ашмяны – раённае. У снежні 2004 года выйшаў першы нумар інфармацыйнага бюлетэня пад назвай «Романолав» («Цыганскае слова»). У нашай дзяржаве добра вядомы ансамблі цыганоў: «Джана Рома» з Ашмян, «Тэрнэ Бэрша» з Магілёва, «Гіля Ромэн» з Лельчыц [16].

За апошнія пяць год у абласцях Беларусі не было якіх-небудзь яўных сутыкненняў і канфліктаў на этнічнай, расавай і канфесійнай аснове, забяспечана прававая роўнасць як рэлігійных, так і нацыянальных груп. Паміж культурна-нацыянальнымі аб'яднаннямі Беларусі існавалі добрыя сяброўскія сувязі. Гэтае сцвярджэнне варта адлюстраваць на прыкладзе Віцебскай вобласці.

Пачынаючы з 2001 года, адзін раз на два гады ў раённым цэнтры Міёры адбываўся абласны фестываль нацыянальных культур пад дэвізам «Нас аб'яднала зямля Беларусі». Яго мэтай з'яўлялася ўмацаванне творчых і дзелавых адносін паміж установамі культуры і грамадскімі нацыянальнымі арганізацыямі, азнаямленне насельніцтва з самабытнай культурай народаў, якія жывуць у вобласці. На фестывалях уласную творчасць прадстаўлялі беларусы, рускія, яўрэі, палякі, армяне, літоўцы, цыганы, узбекі, татары, комі. Рэгіянальнае свята «Браслаўскія бліскавіцы» мае на мэце адраджэнне спеўных, танцавальных, абрадавых, гульнявых традыцый і развіццё рамёстваў народаў-суседзяў: беларусаў, латышоў і літоўцаў. Свята дзіцячай творчасці «Дзвіна–Двина–Даугава» ўключае ў сябе тэатралізаванае шэсце, свята плытагонства, вадзяную феерыю, выставы і канцэрты самадзейных калектываў з Беларусі, Расіі і Латвіі. Святам яднання розных нацыянальных культур стаў «Узгорскі кірмаш» [11].

Неабходна адзначыць, што грамадскія аб'яднанні нацыянальных супольнасцяў не толькі спажыўцы з «кішэні» падаткаплацельшчыкаў альбо краін сваёй этнічнай радзімы. Яўрэйскія, польскія, нямецкія і іншыя аб'яднанні неаднаразова аказвалі гуманітарную дапамогу дзяржаўным установам, інтэрнатам Беларусі. Напрыклад, ГА немцаў з Бабруйска падаравала аргтэхніку савету па справах рэлігій і нацыянальнасцей Магілёўскага аблвыканкама, у 2003–2004 гадах Віцебскае гарадское ГА «Рускі культурны цэнтр «Русь» выступіла з дабрачыннай акцыяй – перадала ў фонды абласной і цэнтральнай бібліятэк г. Віцебска 440 асобнікаў новых кніг, якія былі выдадзены ў Расіі, пасля правядзення фестывалю «Усходні слодыч» у Мінску значныя сродкі былі пералічаны інтэрнатам Мінска, на пабудову Нацыянальнай бібліятэкі [17].

Зроблены аналіз міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных арганізацый (рускіх, татараў, палякаў, украінцаў, літоўцаў, цыганоў, азербайджанцаў, грузін, афганцаў, яўрэяў, немцаў, карэйцаў, грэкаў, казахаў) дазваляе зрабіць некаторыя высновы.

Пераважная большасць з іх займаецца захаваннем нацыянальных традыцый і прапагандай сваёй культуры шляхам стварэння калектываў мастацкай самадзейнасці, правядзення канцэртаў, конкурсаў, фестываляў, выстаў і г.д. Значная частка прадстаўляе розныя інтарэсы сваіх сяброў (членаў) у дзяржаўных і іншых установах; займаецца захаваннем і прапагандай помнікаў гісторыі і культуры свайго народа; паставіла перад сабою мэту нацыянальнага адраджэння і развіцця культуры, каб захаваць самаатаясамленне і пазбег-

нуць асіміляцыі. Амаль палова імкнецца адстойваць сацыяльныя і эканамічныя правы, дапамагаць суайчыннікам; садзейнічаць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці. Трэцяя частка плануе абараняць нацыянальныя і грамадзянскія правы, годнасць; займаецца дабрачыннай дапамогай і ўшанаваннем памяці славутых асоб сваёй нацыянальнасці, ахвяр Халакосту і г.д. 15–20% – спрыяюць грамадскай актыўнасці асобам сваёй нацыянальнасці, ствараюць магчымасці для раскрыцця ўласнага творчага патэнцыялу. Такі ж працэнт грамадскіх арганізацый займаецца асветніцкай дзейнасцю (стварэннем нацыянальных школ, класаў па вывучэнні роднай мовы і г.д.); імкнецца да стварэння нацыянальных цэнтраў, каардынацыі намаганняў у справе захавання нацыянальнай самаідэнтыфікацыі; спрыяе вывучэнню ўласнай гісторыі, займаецца выдавецкай дзейнасцю. Каля 5% ГА садзейнічаюць грамадзянскай самасвядомасці, выступаюць за інтэграцыю з іншымі краінамі, выхоўваюць пачуццё сваёй нацыянальнай выключнасці. Толькі 2,7% арганізацый плануюць, для выканання статутных мэт і задач, выкарыстоўваць актыўныя метады грамадскіх дзеянняў: мітынгі, маніфестацыі, масавыя акцыі і г.д. [12, с. 98].

Можна сцвярджаць, што сярод нацыянальных супольнасцяў найлепш палітычна і культурна арганізаваным з'яўляецца польскае, яўрэйскае, украінскае насельніцтва. Яно больш актыўна ўключаецца ў грамадска-палітычныя працэсы. Латышскае, літоўскае, нямецкае, рускае, цыганскае насельніцтва больш пасіўнае, актывізуе працу пры ўмовах фінансавання з боку.

Галоўнай перашкодай для паспяховай дзейнасці аб'яднанняў нацыянальных супольнасцяў з'яўляліся значныя матэрыяльныя і фінансавыя цяжкасці.

Такім чынам, нацыянальныя супольнасці ў перыяд 1991–2005 гг. адыгрывалі даволі значную ролю ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі, дзейнасць іх грамадскіх арганізацый садзейнічала працэсу фарміравання грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў XX стагоддзі:*** зб. нав. арт. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 1997. – 170 с.
2. ***Нацыянальныя пытанні: матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый»,*** Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г. / рэдкал.: Э. Дубянецкі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: «Беларускі кнігазбор», 2001. – 224 с.
3. ***Беларусь – Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін:*** матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г. / рэдкал.: У.І. Навіцкі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – 434 с.
4. ***Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе:*** материалы междунар. науч. конф., Гродно, 8–9 декабря 2005 г. / Гродн. гос. ун-т; отв. ред. проф. М.А. Можейко. – Гродно, 2006. – 480 с.
5. ***Состав депутатов советов Витебской области*** // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 1966. – Воп. 29. – Спр. 22. – Арк. 24–38.
6. ***Тусевич, Е.*** Живем без оглядки на национальность / Е. Тусевич // Советская Белоруссия. – 2005. – 16 августа. – С. 6.
7. ***Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь:*** даведнік / склад. Н.В. Ходар. – Мінск: «Энцыклапедыкс», 2004. – С. 235–245.
8. ***О выполнении в Витебской области «Программы мер по регулированию этноконфессиональной ситуации в Республике Беларусь» и областной Программы работы с национальными общностями*** // Архіў Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (АКСРН).– Спр. матэрыялы да калегіі № 8 ад 30–31.10.2003 г.
9. ***О материальной базе и состоянии работы СПБ*** // АКСРН. – Фонд «Перапіска аддзела нацыянальнасцей». – Спр. 03–04, 1998. – Т. 1. – Арк. 54.

10. ***К вопросу о белорусско-польских отношениях:*** информационный материал / Институт социально-политических исследований при Администрации Президента Республики Беларусь. – Минск, 2005. – С. 7.
11. ***Степаненко, Н.*** Нас объединила земля Беларуси / Н. Степаненко // Віцьбічы. – 2002. – 27 чэрвеня.– С. 4.
12. ***Нацыянальныя меншасці Беларусі: грамадска-палітычная дзейнасць і сацыяльна-прававы статус: справаздача аб НДП (заключ.)*** / Маг. дзярж. унів. харчавання; кір. тэмы І.А. Пушкін. – Магілёў, 2005. – С. 108. – № Д. Р. 20041397.
13. ***Орда, О.А.*** Роль СМИ в возрождении культуры татар Беларуси / О.А. Орда // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., Гродно, 8–9 декабря 2005 г. / Гродн. гос. ун-т; отв. ред. проф. М.А. Можейко. – Гродно, 2006. – С. 423–427.
14. ***Информация об Республиканском общественном объединении «Белорусская община литовцев»*** // АКСРН. – Спр. 03–04, 2000. – Т. 1.
15. ***Иоффе, Э.*** Джойнт в Беларуси / Э. Иоффе, Б. Мельцер. – Минск: ООО «Мэджик Бук», 1999. – 94 с.
16. ***Информация об общественном объединении «Белорусская цыганская диаспора»*** // АКСРН. – Спр. 03–04, 2003. – Т. 2; 2004. – Т. 2.
17. ***Сообщение о проведении фестиваля «Усходні слодыч»*** // АКСРН. – Спр. 03–04, 2004. – Т. 2.

*S U M M A R Y*

*This article is devoted to the problem of national minority groups' activity, their common features and their role in Belarusian society.*

*The purposes and main activity directions of voluntary organizations of national minority groups in Belarus are analyzed in this article. It also contains a conclusion about significant role of national minority groups in social, political and cultural life in Belarus and in forming of civil society.*

*Поступила в редакцию 23.03.2007*